*УДК 811.161.3’373.21(476.7)*

# Тапанімічная прастора Брэстчыны ў навуковых даследаваннях

**Леванцэвіч Л.В., Якубук Н.Р.**
***Установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”, Брэст***

*Артыкул прысвечаны аналізу стану даследавання тапанімічнай прасторы Брэсцкай вобласці. Большая частка анамастычнай лексікі складаецца са слоў з нацыянальна-культурнай семантыкай. Менавіта таму гэтыя адзінкі ўяўляюць цікавасць не толькі як сродак зносін, але яшчэ і як крыніца шматлікіх і разнастайных ведаў пра нацыянальную гісторыю і культуру. Надзённым з’яўляецца пытанне вывучэння (збірання і аналізу) анамастычнага матэрыялу Брэстчыны. Перш чым рухацца далей, важна ўлічыць тое, што ўжо зроблена, дасягнута, бо ніводная навука не можа паспяхова развівацца без асэнсавання сваёй гісторыі.*

*Мэта артыкула – агляд і аналіз прац па тапаніміі Брэстчыны.*

***Матэрыял і метады.** Матэрыялам для аналізу абраны лексікалагічныя працы па тапаніміі Брэстчыны. Асноўныя метады – апісальны з элементамі бібліяграфічнага, тыпалагічны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Даследчыкі анамастыкі Брэстчыны ўвялі ў навуковы ўжытак значную колькасць тапанімічнага (у тым ліку мікратапанімічнага) матэрыялу. Асноўнымі задачамі навуковых даследаванняў з’яўляліся і з’яўляюцца збор, сістэматызацыя і этымалагізацыя тапанімічнага матэрыялу па ўсіх рэгіёнах Брэстчыны.*

***Заключэнне.** На сучасным этапе працягваюць вывучацца і дапаўняюцца новым матэрыялам набыткі папярэдніх часоў беларускай анамастычнай школы. Беларуская тапаніміка ў прыватнасці, як і анамастыка ў цэлым, выходзіць на лінгвакультуралагічны ўзровень аналізу анамастычнага матэрыялу. На сённяшні дзень зусім не даследаванымі застаюцца такія анамастычныя адзінкі Брэстчыны, як касмонімы і астронімы (назвы зон касмічнай прасторы, галактык, сузор’яў), хранонімы (назвы адрэзкаў часу), тэонімы (імёны багоў і міфалагічных істот), агіёнімы (імёны святых), заонімы (мянушкі жывёл) някронімы (назвы могілак); мала вывучаны агаронімы (назвы плошчаў, рынкаў), харонімы (назвы раёнаў горада), айкадамонімы (назвы будынкаў), эклезіёнімы (назвы месцаў правядзення рэлігійных абрадаў), эргонімы (назвы дзелавых аб’яднанняў людзей, прадпрыемстваў).*

***Ключавыя словы:** айконімы, анамастыка, мікратапонімы, тапонімы, Брэстчына.*

*(Ученые записки. – 2018. – Том 25. – С. 129–136)*

# Brest Region Toponymic Space in the Scientific Research

**Levantsevich L.V., Yakubuk N.R.**
***Educational Establishment "Brest State University named after A.S. Pushkin", Brest***

*The article analyzes how the toponymic space of Brest region is studied. The majority of onomastic vocabulary consists of words of national cultural meaning. That is why these units are very interesting not only as the means of communication but also as the source of different and numerous knowledge about national culture and history. The problem of studying (collecting and analyzing) the onomastic material of Brest region is an urgent question. Before moving further it is important to consider the work that has been done until that time. No science can develop successfully without studying its history. The goal of the article is to observe and analyze the works on toponyms of Brest region.*

***Materials and methods.** The materials for analysis are the works on toponymy of Brest region that are taken from lexicographical research. The main research methods are descriptive with the elements of biography and typological.*

***Findings and their discussion.** The researchers of Brest onomastic have introduced into the sphere of research the large number of toponymic material (including microtoponymy). The main task of scientific research is collection, systematization and etymologization of toponymic material in all districts of Brest region.*

***Conclusion.** At the present stage the accumulated materials of the Belarusian onomastic school are being complemented. Belarusian toponymy in particular as well as onomastics in general has come to linguoculturological level of studying of onomastic material. Today such branches of Brest onomastics as cosmonyms and astronyms (the names of outer space zones, galaxies and constellations) chrononyms (names of time intervals), theonyms (names of gods and mythological creatures), agionyms (names of saints), zoonyms (nicknames of animals), necronims (names of cemeteries) are not studied at all. Agrononyms (names of squares and markets), khoronyms (names of city districts), oikodomonyms (names of buildings), ecclesionyms (places of religious rites), ergonyms (names of business associations of people, enterprises) are little studied.*

***Key words:** oikonyms, onomastic, microtoponyms, moponyms of Brest region.*

*(Scientific notes. – 2018. – Vol. 25. – P. 129–136)*

Агульнавядома: гістарычная перспектыва, будучыня нацыі і народа непасрэдна залежыць ад здольнасці этнасу не толькі захаваць, але яшчэ асэнсаваць і ўключыць у жыццёвую практыку сённяшняга і наступнага пакаленняў духоўныя і матэрыяльныя здабыткі мінулага. Выключна важная роля ў гэтым працэсе належыць гістарычнай памяці, якая без перабольшання з'яўляецца вызначальнай рысай цывілізаванасці народа, выяўляе адметнасць яго нацыянальнага аблічча.

Беларусы разам з іншымі еўрапейскімі народамі спрадвеку мелі багатую культурна-гістарычную і моўную спадчыну, аднак не заўсёды яе бераглі. Вяртанне і захаванне многіх гістарычных каштоўнасцей зараз з'яўляецца адной з галоўных задач грамадства. Анамастычныя адзінкі належаць да той часткі мовы беларускага народа, якая адрознівае яго ад астатніх славянскіх народаў, тым самым выяўляючы самабытнасць, непасрэднасць мовы беларусаў. Тым больш, што народ ніколі не называў аб'екты, што знаходзяцца навокал, выпадкова. Тапонімы ўзнікаюць у пэўных гістарычных умовах і адлюстроўваюць розныя бакі жыцця і дзейнасці чалавека. "…анімічныя адзінкі – у гісторыі, а гісторыя – у анімічных адзінках", – сцвярджае даследчыца Г.М. Мезенка. Уласныя назвы захоўваюць каштоўныя звесткі пра гісторыю роднага краю, яго сівую старажытнасць і нядаўняе мінулае. Гэта неад'емная частка нашай мовы ў цэлым. Таму збор анамастычнага матэрыялу, яго вывучэнне і лексікаграфічнае апісанне па-ранейшаму застаецца адной з актуальных і навукова важных задач.

Вывучэнне асаблівасцей мовы гаворак Брэсцка-Пінскага Палесся пачалося яшчэ ў XIX ст. і працягваецца па сённяшні дзень. Даследаванне вядзецца па розных напрамках: ад слоўнікавых падборак да тэарэтычнага асэнсавання моўных з'яў. У асноўным гэта асобныя артыкулы, якія змяшчаюць матэрыял па анамастыцы, лексіцы, фанетыцы. У нешматлікіх працах закранаюцца пытанні па дыялектнай марфалогіі, этналінгвістыцы. Апублікаваны лінгвагеаграфічныя рэгіянальныя атласы гаворак Бярозаўскага, Івацэвіцкага і Пружанскага раёнаў. У апошнім дзесяцігоддзі XX ст. – на пачатку XXI ст. пачалі з'яўляцца артыкулы па дыялектнай фразеалогіі. Агляд прац па народнай анамастыцы Брэсцка-Пінскага Палесся праведзены на пачатку XX ст. у артыкуле "Крыніцазнаўства даследаванняў анамастыкі мовы Брэсцка-Пінскага Палесся" (Л.В. Леванцэвіч).

Мэта артыкула – агляд і аналіз прац па тапаніміі Брэстчыны.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для аналізу абраны лексікалагічныя працы па тапаніміі Брэстчыны. Асноўныя метады – апісальны з элементамі бібліяграфічнага, тыпалагічны.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. У XIX ст. зборам тапанімічнага матэрыялу на Беларусі, у тым ліку на Палессі, займаўся этнограф, географ, археолаг, фалькларыст, тапаніміст З. Даленга-Хадакоўскі (1784–1825). Ён лічыў, што пры пісьмовай фіксацыі неабходна перадаваць назвы так, як іх вымаўляюць карэнныя жыхары. Даследчык прапанаваў заняцца зборам геаграфічных назваў (урочышчаў, малых і вялікіх рэк, гарадоў і паселішчаў). Ён склаў карту назваў вядомых яму гарадзішчаў і старажытных урочышчаў, асаблівую ўвагу звярнуў на назвы населеных пунктаў, якія паходзяць ад найменняў язычніцкіх бостваў, даказваў паходжанне некаторых гарадоў і рэк ад такіх найменняў (Лада, Лель), а таксама старажытны характар паходжання, звярнуў увагу на распаўсюджанне гідронімаў і тапонімаў з назвай Дунай (Д.-Ходаковский. Материалы к «Сравнительному словарю географических названий славянских городищ», 1820–1823).

У пасляваенны перыяд у сваіх працах В.А. Жучкевіч [1, 2], разглядаючы пытанні тапаніміі Беларусі, прыводзіць матэрыял з Брэстчыны.

Даследаванне "Мікратапанімія Беларусі" [3] уключае назвы ўрочышчаў Гродзеншчыны, Брэстчыны і Міншчыны. Загаловачнае слова суправаджаецца граматычнымі паметамі, указваецца від (лес, балота, поле) і значэнне мікратапоніма.

Значнае месца ў тапаніміі Брэстчыны займала праца Я.Н. Рапановіча "Слоўнік назваў населеных пунктаў Брэсцкай вобласці" [4]. Слоўнік ахоплівае назвы ўсіх населеных пунктаў Брэстчыны, у тым ліку ўласныя назвы вёсак, што зніклі па прычыне далучэння да гарадоў і пасёлкаў, перайменавання, сселення, знішчэння ў гады вайны.

У 2010 г. выйшла новая праца такога тыпу – "Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Брэсцкая вобласць" [5]. Сярод аўтараў – выкладчыкі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (В.М. Емельяновіч, З.М. Заіка, Н.Р. Якубук). У выданні айконімы падаюцца на беларускай мове кірыліцай і лацінкай, а таксама на рускай мове. Беларускамоўная частка даведніка ўключае нарматыўныя найменні з націскамі, граматычнымі паметамі і парадыгмамі скланення, варыянты рэестравых найменняў, у працы прыводзяцца ў тым ліку страчаныя айконімы.

Асобныя звесткі пра тапанімію Брэстчыны можна знайсці ў кнігах І.Я. Яшкіна, В.В. Шура, В.П. Лемцюговай, А.М. Мезенка, М.Л. Лыча, А.Ф. Рогалева, М.В. Бірылы і інш.

Вывучэнню анамастыкі Брэстчыны прысвечаны тры кандыдацкія дысертацыі. В.М. Емельяновіч у сваёй працы "Микротопонимия северо-западной части Брестской области" даследуе мікратапонімы. Дысертацыя Н.Р. Якубук "Айканімія і гідранімія Пабужжа. Праблемы ўзаемадзеяння" ўключае тэарэтычнае даследаванне

айконімаў і гідронімаў Брэстчыны. Айканімія і мікратапанімія беларускай часткі Заходняга Палесся паслужыла аб’ектам даследавання Т.М. Аліферчык у дысертацыйнай рабоце “Тапанімія Заходняга Палесся ў этналінгвістычным аспекце”. Тапанімічная прастора Брэсцкай вобласці і надалей застаецца аб’ектам навуковых інтарэсаў названых мовазнаўцаў.

На сённяшні дзень з усіх відаў тапонімаў найбольш даследаванай з’яўляецца айканімія Брэстчыны. Айканімікон Баранавіцкага, Жабінкаўскага (разам з В.М. Андрасюк), Камянецкага, Кобрынскага, Лунінецкага, Маларыцкага, Пінскага, Столінскага (разам з С.С. Клундук) раёнаў вывучаўся і вывучаецца Н.Р. Якубук [Назвы артыкулаў і бібліяграфічныя дадзеныя тут і далей глядзі ў дадатку “Крыніцазнаўства тапаніміі Брэстчыны”], Пружанскага і Брэсцкага райнаў – В.М. Емельяновіч. У публікацыях названых аўтараў даецца лексіка-семантычная характарыстыка айконімаўтваральных асноў, лексічных рэсурсаў, якія паслужылі матывавальнай базай для фарміравання ўласных назваў паселішчаў. Аўтарамі адзначаецца, што айконімы любой тэрыторыі ў абсалютнай сваёй большасці індывідуальныя і непаўторныя, што найперш праяўляецца ў іх семантыцы, аднак у кожным з рэгіёнаў вылучаюцца наступныя лексіка-семантычныя групы: айконімы апелятыўнага паходжання, айконімы антрапанімічнага паходжання, адтапанімічныя айконімы.

Афіцыйныя назвы населеных пунктаў Кобрынскага раёна і іх мясцовыя тапанімічныя варыянты разглядаюцца ў артыкулах С.А. Сянкевіч і В.І. Сянкевіч. Лінгвакраязнаўчы змест язычніцкай (культавай) айканіміі Палесся выяўлены Л.В. Леванцэвіч. М.М. Аляхновічам і Л.В. Леванцэвіч распрацаваны тапанімічныя карты Брэстчыны: закартаграфаваны тапонімы з кампанентамі, што характарызуюць прыродна-геаграфічныя асаблівасці мясцовасці, велічыню пасяленняў, якія звязаны з язычніцкімі бoствамі і якія паходзяць ад этнонімаў. В.У. Міцкевіч даследаваў айканімію Пінскага павета XVI стагоддзя. Падрыхтаваны слоўнікі па айканіміі Століншчыны (аўтар З.М. Заіка) і Бярозаўшчыны (аўтар Г.М. Пыж’янава).

Зусім не даследаванай пакуль застаецца айканімія Ганцавіцкага, Драгічынскага, Іванаўскага, Івацэвіцкага, Ляхавіцкага раёнаў.

Першая манаграфія па тапаніміцы Брэстчыны падрыхтавана Т.М. Аліферчык (“Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект”, 2013). У працы выяўлена культурна маркіраваная інфармацыя ў заходнепалескай тапаніміі; праведзена вывучэнне тапаніміі ў межах карэляцыі мова : духоўная культура народа, зроблена спроба высветліць матывацыю тапонімаў і вызначыць прасторавыя параметры – лакалізацыю і канфігурацыю аб’ектаў у прасторы. У даследаванні ўпершыню аналізуюцца заходнепалескія айконімы і мікратапонімы ў этналінгвістычным асвятленні. Аўтарам праведзены аналіз айконімаў і мікратапонімаў з культурнай інфармацыяй, вызначаны іх матывацыя і матывавальная аснова, прааналізаваны віды рэпрэзентацыі семантычных апазіцый свой – чужы і верх – ніз у тапаніміі, выяўлены асаблівасці арганізацыі прасторавых адносін па вертыкалі.

Гідранімія Пабужжа вывучаецца Н.Р. Якубук у структурна-словаўтваральных і лексіка-семантычных адносінах. Выяўлена, што абсалютная большасць афіксальных айконімаў адзначанага рэгіёна ўтворана пры дапамозе суфіксаў. У адпаведнасці са значэннем утваральнай асновы вылучаецца дзве асноўныя лексіка-семантычныя групы гідронімаў: апелятыўнага і анамастычнага паходжання. Структурна-семантычную характарыстыку гідронімаў Бярозаўскага раёна праводзіць Л.В. Леванцэвіч (аналізуецца этымалогія азёр і рэк рэгіёна).

Вывучэнню мікратапаніміі Брэстчыны прысвечаны артыкулы В.М. Емельяновіч і Н.Р. Якубук. В.М. Емельяновіч аналізуюцца асноўныя словаўтваральныя тыпы мікратапонімаў, структурныя тыпы мікратапонімаў-назоўнікаў, мікратапонімы ў форме прыметніка, даследуюцца асаблівасці ўтварэння мікратапонімаў адантрапанімічнага і адапелятыўнага паходжання (ад геаграфічных тэрмінаў і ад земляробчай лексікі), асаблівасці ўтварэння мікратапонімаў паўночна-заходняй часткі Брэстчыны ў параўнанні з мікратапаніміяй іншых тэрыторый. Н.Р. Якубук займаецца вывучэннем семантычных и структурных адметнасцей мікратапаніміі Пабужжа. Артыкулы па мікратапаніміі апублікаваны Л.В. Леванцэвіч, М.Р. Гарбачыкам, Н.І. Васілюк, З.М. Заікай, Н.І. Кацюрубай, М.А. Дарошка, Н. Міснік. Назвы ўрочышчаў асобных вёсак Брэстчыны даследавалі С.С. Клундук, Т.А. Кісель, В.Б. Пераход, Н.Р. Якубук.

Адзінкавыя артыкулы прысвечаны структурным і семантычным асаблівасцям урбананіміі Брэста (Л.А. Гадуйка, Н.П. Галімава, Н.Р. Якубук), Баранавіч (Н.Р. Якубук), Пінска (Л.А. Гадуйка, М. Фамелец). Як частку анамастычнай прасторы горада і як рэпрэзентанты кодаў культуры эргаўрбонімы г. Брэста вывучаюць Л.А. Гадуйка і В.А. Караба.

Тапанімія Брэстычны даследуецца ў межах выканання заданняў Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2016–2020 гады. Выкладчыкамі ўстановы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна” выконваюцца наступныя фінансуемыя НДП: “Ономастикон Брестчины: прагматонимия и эргонимия” (навуковы кіраўнік – В.Б. Пераход), “Лінгвістычнае

краязнаўства Брэстчыны: узаемадзеянне мовы і культуры" (навуковы кіраўнік – Л.В. Леванцэвіч). Падчас працы над гадавым этапам "Анамастычная лексіка: нацыянальна-культурны кампанент" (2017 г.) праводзіўся збор і аналіз мікратапонімаў, якія захоўваюць нацыянальна-культурную семантыку.

**Заключэнне.** На сучасным этапе працягваюць вывучацца і дапаўняюцца новым матэрыялам набыткі папярэдніх часоў беларускай анамастычнай школы. Беларуская тапаніміка ў прыватнасці, як і анамастыка ў цэлым, выходзіць на лінгвакультуралагічны ўзровень аналізу анамастычнага матэрыялу. На сённяшні дзень зусім не даследаванымі застаюцца такія анамастычныя адзінкі Брэстчыны, як касмонімы і астронімы (назвы зон касмічнай прасторы, галактык, сузор'яў), хранонімы (назвы адрэзкаў часу), тэонімы (імёны багоў і міфалагічных істот), агіёнімы (імёны святых), заонімы (мянушкі жывёл) някронімы (назвы могілак); мала вывучаны агаронімы (назвы плошчаў, рынкаў), харонімы (назвы раёнаў горада), айкадамонімы (назвы будынкаў), эклезіёнімы (назвы месцаў правядзення рэлігійных абрадаў), эргонімы (назвы дзелавых аб'яднанняў людзей, прадпрыемстваў).

## Літаратура


1. Жучкевич, В.А. Происхождение географических названий Белоруссии / В.А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1961. – 79 с.
2. Жучкевич, В.А. Краткий топонимический словарь Белоруссии / В.А. Жучкевич. – Минск : Изд-во БГУ, 1974. – 447 с.
3. Мікратапанімія Беларусі. Матэрыялы; уклад. Г.У. Арашонкава [і інш.]; рэд. М.В. Бірыла, Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 328 с.
4. Рапановіч, Я.Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Брэсцкай вобласці / Я.Н. Рапановіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 176 с.
5. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь : Брэсцкая вобл. : нармат. давед. / І.А. Гапоненка [і інш.]; пад рэд. В.П. Лемцюговай. – Мінск : Тэхналогія, 2010. – 319 с.


## Дадатак "Крыніцазнаўства тапаніміі Брэстчыны"


1. Алексіюк, М. Пра тапаніміку Брэстчыны / М. Алексіюк // Полымя. – 1986. – № 2. – С. 239.
2. Аліферчык, Т. М. Этнонімы ляхі і мазуры ў заходнепалескай тапаніміі / Т.М. Аліферчык // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філал. навук. – 2009. – № 2. – С. 117–121.
3. Аліферчык, Т.М. Аб ландшафтнай мадэлі тапаніміі Заходняга Палесся / Т.М. Аліферчык // Беларуская лінгвістыка / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ.; рэдкал.: А.А. Лукашанец [і інш.]. – 2009. – Вып. 64. – С.78–87.
4. Аліферчык, Т.М. Узаемадзеянне этнонімаў русіны і ліцвіны (на матэрыяле тапаніміі Заходняга Палесся) / Т.М. Аліферчык // Молодежь в науке – 2009: прил. к журн. "Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі": в 5 ч. / НАН Беларуси, Совет молодых учёных; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск : 2010. – Ч. 2. Серия гуманитарных наук. – С. 271–276.
5. Аліферчык, Т. М. Да этымалогіі некаторых заходнепалескіх тапонімаў / Т. М. Аліферчык // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі: матэрыялы Рэсп. навук. канф., Брэст, 14–15 кастр. 2011 г. / Брэсц. дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. М.І. Новік. – Брэст, 2012. – С. 3–5.
6. Аліферчык, Т.М. Вобразная мікратапанімія на беларускай тэрыторыі / Т.М. Аліферчык // Нацыянальна-культурны кампанент у дыялектнай і літаратурнай мове : матэр. Рэсп. навук.-практ. канф. (Брэст, 18–19 кастр. 2012 г.). – Брэст : Альтернатива, 2013. – 246 с.
7. Аліферчык, Т. М. Тапанімія Заходняга Палесся: этналінгвістычны аспект / Т. М. Аліферчык. – Мінск : Беларуская навука, 2013. – 255 с.
8. Аляхновіч, М.М. Лінгвакраязнаўства: вучэбна-метадычны дапаможнік / М.М. Аляхновіч, Л.В. Леванцэвіч. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2006. – 64 с.
9. Андрасюк В.М. Айканімія Жабінкаўшчыны / В.М. Андрасюк, Н.Р. Якубук, // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы II Междунар. науч. конф. «Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах» / отв. ред. Р. М. Козлова. – Гомель : УО "ГГУ имени Ф. Скорины", 2004. – С. 272–276.
10. Ботвина И. Реализация принципа номинации внутригородского объекта по отношению к другим объектам в урбанонимии г. Бреста / И. Ботвина, Н.Р. Якубук // Моўная адзінка ў кантэксце часу : зб. матэрыялаў Рэспубл. навук.-практ. канф., Брэст, 20 лістапада 2015 г. / Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна; рэдкал.: Л.В. Леванцэвіч [іінш.]. – Брэст: БрДУ, 2016. – С. 216–221.
11. Василюк, Н.И. Названия балот в говорах Брестчины / Н.И. Василюк // Региональные особенности восточнославянских языков, литературы, фольклора и методы их изучения. – Гомель, 1985. – С. 26 –28.
12. Васілюк, Н.І. Лексіка-семантычныя тыпы мікратапаніміі паўднёва-заходняй часкі Брэстчыны / Н.І. Васілюк // Беларуская анамастыка. – Мінск : Навука і тэхн., 1985. – С.103–114.
13. Гадуйка, Л.А. Састаўныя айконімы Пабужжа / Л.А. Гадуйка, Н.Р. Якубук // Праблемы адукацыі, навукі, культуры Беларускага Палесся : Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. Ч. III. – Брэст, 1997. – С. 3–4.
14. Гадуйка, Л.А. Структурна-семантычная характарыстыка назваў лінейных аб'ектаў г. Брэста / Л.А. Гадуйка, Н.Р. Якубук // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска–Пінскага Палесся ў мове і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф. / адк. рэд. М.М. Аляхновіч. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2002. – С. 26–30.
15. Галімава Н. П. Семантычныя тыпы урбанонімаў г. Брэста / Н. П. Галімава, Н. Р. Якубук // Studia Russica XX. – Будапешт, 2003. – С. 159–161.
16. Гарбачык, М.Р. З мікратапаніміі вёсак Застаўе і Бездзеж Драгічынскага раёна / М.Р. Гарбачык, Н.Л. Галуц, Г.П. Юскевіч // Пачатковая адукацыя і выхаванне: праблемы, пошукі, знаходкі. – 1995. – Вып. 4. – С. 156–158.
17. Гарбачык, М.Р. З мікратапаніміі вёскі Туляцічы / М Р. Гарбачык, В Л. Станкевіч // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф. – Брэст, 1994. – С. 60–63.
18. Годуйко, Л.А. Урбанонимия города Пинска / Л.А. Годуйко // Шостыя рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні : матэрыялы рэспубл. навук. канф., прысвечанай 85-годдзю з дня нараджэння У А. Калесніка, Брэст, 26 кастрычніка 2007 года // «Слова аб палку Ігаравым» у літаратуры і духоўнай культуры славянскіх народаў: матэрыялы міжнар. нав. канф., Брэст, 27–28 красавіка 2007 года; пад агульн. рэд З.П. Мельнікавай, Г.М. Праневіча. – Брэст : «Альтернатива», 2008. – С. 166–170.

19. Годуйко, Л.А. Эргонимы как часть ономастического пространства города Бреста / Л.А. Годуйко // Вучоныя запіскі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна : зборнік навуковых прац. – 2012. – Выпуск 8. – Ч.1. – С. 270–278.
20. Годуйко, Л А. Эргоурбонимия города Бреста / Л А. Годуйко // Siowiacskie pogranicza jako przedmiot badac jkzykoznawczych i onomastycznych : W 110 rocznick urodzin Profesora Wiadysiawa Kuraszkiewicza (1905–1997) ; red. : F. Czyџewski, M. Olejnik, A. Pihan-Kijasowa. – Lublin–Wiodawa, 2015. –S. 181–190.
21. Годуйко, Л.А. Названия объектов общественного питания в лингвистическом ландшафте города Бреста / Л А. Годуйко, О.А. Корабо // Язык и культура Юга России: аспекты толерантного взаимодействия : сб. науч. тр. по материалам Междунар. науч.-практ. конф. Волгоград, 23–24 апр. 2015 г. / отв. ред. Е.В. Брысина. – Волгоград : Изд-во ВГСПУ «Перемена», 2015. – С. 65–74.
22. Годуйко, Л.А. Эргоурбонимы как репрезентанты кодов культуры / Л.А. Годуйко, О.А. Корабо // Славянские языки : системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : сб. науч. тр. / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина ; редкол. : Л.А. Годуйко [и др.] ; под общ. ред. О.Б. Переход. – Брест : БрГУ, 2016. – Ч. 1. – С. 200–206.
23. Дарошка, М.А. Палескія мікратапонімы з семантычнай адзінай асновай балота / М.А. Дарошка // Рэгіянальныя асаблівасці ўсходнеславянскіх моў : тэз. дакл. і павед. / пад рэд. У.В. Анічэнкі. – Гомель, 1990. – С. 38–40.
24. Емельяновіч, В.М. Асноўныя словаўтваральныя тыпы мікратапаніміі Брэстчыны / В.М. Емельяновіч // Беларуская мова і літаратура ў ВНУ : тэз. дакл. навук.-метад. канф. – Брэст, 1971. – С. 195–198.
25. Емельяновіч, В.М. Мікратапонімы Пружаншчыны ў форме прыметніка / В.М. Емельяновіч // Беларуская мова і мовазнаўства : міжвуз. зб. – Мінск : Выд-ва БДУ, 1976. – Вып. 4. – С. 75–79.
26. Емельяновіч, В.М. Структурныя тыпы мікратапонімаў-назоўнікаў (на матэрыяле Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці) / В.М. Емельяновіч // Беларуская анамастыка : зб. арт. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – С. 139–160.
27. Емельяновіч, В.М. Назвы-арыенціры ў мікратапаніміі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці / В.М. Емельяновіч // Беларус. мова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – Вып. 7. – С. 76–88.
28. Емельяновіч, В.М. Земляробчая лексіка як крыніца мікратапаніміі паўночна-заходняй часткі Брэсцкай вобласці / В.М. Емельяновіч // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1983. – № 2. – С. 107–114.
29. Емельяновіч, В.М. Геаграфічная тэрміналогія як крыніца мікратапаніміі (на матэрыяле Пружанскага і Камянецкага раёнаў Брэсцкай вобласці) / В.М. Емельяновіч // Беларуская анамастыка : зб. арт. / рэд.: М.В. Бірыла, В.П. Лемцюгова. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – С. 5–15.
30. Емельяновіч, В.М. Асаблівасці мікратапаніміі паўночна-заходняй часткі Брэсцкай вобласці ў параўнанні з мікратапаніміяй іншых тэрыторый / В.М. Емельяновіч // Рэгіянальныя пытанні мовы, літаратуры і фальклору : матэрыялы Усесаюз. канф. – Гомель, 1984. – С. 78–88.
31. Емельяновіч, В.М. Особенности микротопонимии Брестчины / В.М. Емельяновіч // Региональные особенности восточнославянских языков, литератур, фольклора и методы их изучения : тез. докл. и сообщ. III Респ. конф. : в 2 ч. – Гомель, 1985. – Ч. 1. – С. 43–46.
32. Емельяновіч, В.М. Назвы антрапанімічнага паходжання ў мікратапаніміі паўночна-заходняй часткі Брэсцкай вобласці / В.М. Емельяновіч // Беларуская мова : міжведам. зб. – Мінск : Выд-ва "Універсітэцкае", 1986. – Вып. 14. – С. 78–84.
33. Емельяновіч, В.М. Назвы тыпаў пасяленняў Пружаншчыны / В.М. Емельяновіч // Рэгіянальныя асаблівасці ўсходнеславянскіх моў : тэз. дакл. і павед., Гомель, 26–27 кастр. 1990 г. / пад рэд. У.В. Анічэнкі. – Гомель, 1990. – С. 41–43.
34. Емельяновіч, В.М. Традыцыйнае і новае ў тапаніміі Брэстчыны / В.М. Емельяновіч // Мова, літаратура, краязнаўства : тэз. дакл. навук.-практ. канф. : у 2 ч. – Брэст : БрДУ, 1992. – Ч. I. – С. 7–9.
35. Емельяновіч, В.М. З гісторыі некаторых назваў / В.М. Емельяновіч // Берасцейскія карані : гіст.-краязн. і літ. зб. – Брэст, 1993. – С. 108–111.
36. Емельяновіч, В. З гісторыі назваў Берасцейшчыны: Брэст, Драгічын, Жабінка, Камянец, Кобрын, Пружаны / В. Емельяновіч // Роднае слова. – 1993. – № 9. – С. 24–25.
37. Емельяновіч, В.М. Азнаямленне студэнтаў з працэсам узаемапранікнення тапонімаў і мікратапонімаў на беларуска-польскім памежжы / В.М. Емельяновіч // Беларуска-польскае ўзаемадзеянне ў галіне культуры : матэрыялы навук.-практ. канф. / рэд.: В.Я. Ляшук [і інш.]. – Брэст : БрДПІ, 1993. – С. 60–65.
38. Емельяновіч, В.М. Назвы-перанясенні ў мікратапаніміі Берасцейшчыны / В.М. Емельяновіч // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф. – Брэст : БрДУ, 1994. – С. 65–67.
39. Емельяновіч, В.М. З назіранняў над айканіміяй Жабінкаўшчыны / В.М. Емельяновіч, І.В. Галанова // Жыццём слугуючы Айчыне : матэрыялы навук. канф. да 80-х угодкаў прафесара Фёдара Янкоўскага / рэд.: Г.М. Малажай, М.М. Аляхновіч. – Брэст : БрДУ, 1999. – С. 108–110.
40. Емельяновіч, В.М. Назвы флексійнага, суфіксальна-флексійнага ўтварэння ў тапаніміі Берасцейшчыны / В.М. Емельяновіч // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы Междунар. науч. конф., г. Гомель, 21–22 нояб. 2002 г. – Гомель : УО "ГГУ им Ф. Скорины", 2002. – С. 75–79.
41. Емельяновіч, В.М. Тапонімы Берасцейшчыны на -шчына, -аўшчына, -оўшчына, -еўшчына / В.М. Емельяновіч // Берасцейска-Пінскае Палессе : Мова, літаратура, гісторыя : матэрыялы канферэнцыі, прысвеч. 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка, 24–25 кастр. 2002 г. – Брэст : Выд-ва С.Б. Лаўрова, 2002. – С. 66–70.
42. Емельяновіч, В.М. Айконімы Берасцейшчыны апелятыўнага паходжання / В.М. Емельяновіч // Наша класіка : традыцыі, наватарства, яе сучасная інтэрпрэтацыя ў ВНУ і школе : Матэрыялы Рэсп. навук. канф., 23–24 снежня 2002 г. У 2-х ч. – Ч. 2. – Брэст : БрДзУ імя А.С. Пушкіна, 2003. – С. 56–61.
43. Заіка, З.М. З мікратапаніміі Століншчыны / З.М. Заіка // Беларуская анамастыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – С. 140–149.
44. Заіка, З.М. Слоўнік тапонімаў і адтапанімічных дэрыватаў у арэале заходнепалескіх гаворак / З.М. Заіка. – Брэст : БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2001. – 68 с.
45. Кацюруба, Н.І. З мікратапаніміі Брэстчыны / Н.І. Кацюруба // Пачатковая адукацыя і выхаванне : праблемы, пошукі, знаходкі / рэд. В.І. Сянкевіч. – 1995. – Вып. 4. – С. 167–170.
46. Кісель, Т.А. З мікратапаніміі в. Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці / Т.А. Кісель, Н.Р. Якубук // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі : зб. матэр. навук. канф. да 75-годдзя з дня нараджэння Г.М. Малажай. – Брэст : Альтэрнатыва, 2013. – С. 114–117.
47. Кісель, Т. А. Фітонімы-назвы парод дрэў як структур-

ныя кампаненты айканіміі Брэсцка-Пінскага Палесся / Т.А. Кісель, Н.Р. Якубук // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : сб. науч. тр. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т им. А.С. Пушкина ; под общ. ред. О. Б. Переход. – Брест : БрГУ, 2014. – Ч. 1. – С. 248–253.
48. Кісель, Т.А. Спецкурс "Тапанімія Брэстчыны" для студэнтаў-філолагаў / Т.А. Кісель, Н.Р. Якубук // Теория и практика обучения русскому языку как иностранному и другим лингвистическим дисциплинам в высшей школе : сб. науч. ст. / под общ. ред. О.Б. Переход. – Брест: БрГУ, 2014. – С. 125-128.
49. Клімчук, Ф.Д. Гідронімы Выганаўскага Палесся (моўна-этнічная інтэрпрэтацыя) / Ф.Д. Клімчук, Я.Р. Самуйлік // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках : тез. докл. II Респ. конф. – Гродна, 1986. – С. 64–67.
50. Клундук, С.С. Айканімія Століншчыны: структурна-семантычны аспект / С.С. Клундук, Н.Р. Якубук // Прыроднае асяроддзе Палесся: сучасны стан і яго змены: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Брэст, 2002. – С. 588–590.
51. Клундук, С.С. З айканіміі Століншчыны / С.С. Клундук, Н.Р. Якубук // Актуальныя пытанні славянскай анамастыкі: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Гомель, 2002. – С. 256–260.
52. Клундук, С.С. З айканіміі Століншчыны / С.С. Клундук, Н.Р. Якубук // Тураўшчына : Мінулае, сучаснасць, будучыня. Вып. 3. – Мінск : Беларуская навука, 2004. – С. 74–77.
53. Клундук, С.С. З мікратапаніміі в. Фядоры / С.С. Клундук, Н.Р. Якубук // Тураўшчына. Мінулае, сучаснасць, будучыня. Выпуск 4. – Тураў–Мінск : Беларуская навука, 2005. – С. 141–144.
54. Клундук, С.С. Паміж Столінам і Пінскам (нататкі з практыкі) / С.С. Клундук, Н.Р. Якубук // Зб. матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гісторыка-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся: паміж мінулым і будучыняй" (да 450-годдзя г. Століна), 28–29 верасня 2005 года, г. Столін. – Ч. 2. – С. 231–237.
55. Клундук, С.С. Структурна-семантычная характарыстыка мікратапонімаў в. Фядоры / С.С. Клундук // Моўна-культурная прастора Берасцейшчыны : зб. навук. арт. / М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, Каф. гісторыі беларус. мовы і дыялекталогіі : рэдкал. : М.М. Аляхновіч і інш. – Брэст : Альтэрнатыва, 2010. – С. 88–90.
56. Клундук, С.С. Прыродна-геаграфічная тэрміналогія як утваральная база мікратапонімаў Пабужжа / С.С. Клундук, Н.Р. Якубук // Региональная ономастика : проблемы и перспективы исследования : сб. научн. ст. / под научн. ред. А.М. Мезенко. – Витебск : ВГУ им. П.М. Машерова, 2016. – С. 90–93.
57. Леванцэвіч, Л.В. Назвы населеных пунктаў Бярозаўшчыны / Л.В. Леванцэвіч // Праблемы народнай адукацыі, навукі, культуры беларускага Палесся : тэз. дакл. і павед. : у 2 ч. / рэд.: В.І. Башмакоў [і інш.]. – Мазыр, 1992. – С. 103–104.
58. Леванцэвіч, Л.В. Словаўтваральныя тыпы айконімаў (Бярозаўшчына) / Л.В. Леванцэвіч // Навука года : Матэрыялы міжрэгіянальнай навук.-практ. канф. – Брэст, 1993. – С. 34–36.
59. Леванцэвіч, Л.В. Гідронімы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці / Л.В. Леванцэвіч // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф. – Брэст, 1994. – С. 87–89.
60. Леванцэвіч, Л.В. Старажытны горад Палесся / Л.В. Леванцэвіч // Гістарычная брама : гісторыка-краязнаўчы часопіс. – Брэст, 2001. – № 2/3. – С. 70.
61. Леванцэвіч, Л. Таямніца назвы : да этымалогіі тапонімаў Бярозаўшчыны / Л. Леванцэвіч // Гістарычная брама : гісторыка-краязнаўчы часопіс. – 2002. – № 1/2. – С. 74.
62. Леванцэвіч, Л.В. Палеская язычніцкая (культавая) мікратапаніміка / Л.В. Леванцэвіч // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы Междунар. науч. конф. / отв. ред. Р.М. Козлова. – Гомель : УО "Гомел. гос. ун-т имени Ф. Скорины", 2002. – С. 141–145.
63. Леванцэвіч, Л.В. Язычніцкая тапаніміка Палесся : лінгвакраязнаўчы змест / Л.В. Леванцэвіч // Прыроднае асяроддзе Палесся : сучасны стан і яго змены : матэрыялы Міжнар. навук. канф. : у 2 ч. – Брэст, 2002. – Ч. 2. – С. 573–575.
64. Леванцэвіч, Л. В. Палеская язычніцкая (культавая) мікратапаніміка/ Л.В. Леванцэвіч // Актуальные вопросы славянской ономастики. Гомель 21 – 22 ноября 2002. – Гомель, 2002. – С. 141–146.
65. Леванцэвіч, Л.В. След язычніцтва ў анамастыцы // Studia Russika XX, Budapest, 2003. – С. 267–270.
66. Леванцэвіч, Л.В. Анамастыка мовы Брэсцка-Пінскага Палесся ў навуковых даследаваннях / Л.В. Леванцэвіч // Моўнакультурная прастора Берасцейшчыны: зборнік навук. артык. – Брэст : Альтернатива, 2010. – С. 114–118.
67. Леванцэвіч, Л.В. Крыніцазнаўства даследаванняў анамастыкі мовы Брэсцка-Пінскага Палесся / Л.В. Леванцэвіч // Мова Брэсцка-Пінскага Палесся: зб. навук. артык. /М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна, каф. гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі; рэдкал. : М.М. Аляхновіч [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2010. – С 57–65. (112 с.)
68. Леванцэвіч, Л.В. Асноўныя аспекты навуковага даследавання анамастыкі Брэсцка-Пінскага Палесся / Л.В. Леванцэвіч // Моўна-культурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зборнік навуковых артыкулаў у 2 ч. – Брэст : Альтернатива, 2011. – Ч. 1. – С. 193–197.
69. Леванцэвіч, Л.В. Нацыянальная адметнасць анамастыкону вёскі Здзітава Бярозаўскага раёна / Л.В. Леванцэвіч // Беларуская дыялекталогія. Матэрыялы і даследаванні : зб. навук. артыкулаў. – Вып. 3 [рэд. кал. В.М. Курцова, Л.П. Кунцэвіч]. – Мінск : Беларуск. навука, 2014. – С. 129–133.
70. Міцкевіч, В.У. Айканімія Пінскага павету XVI стагоддзя / В.У. Міцкевіч // Берасцейска-Пінскае Палессе: мова, літаратура, гісторыя : матэр. канф. прысв. 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка, 24–25 кастрычніка 2002 г. – Брэст : Выдавецтва С. Лаўрова, 2002. – С. 89–92.
71. Міцкевіч, В.У. Адапелятыўныя айконімы на тэрыторыі Пінскага павета XVI ст. / В.У. Міцкевіч // Літаратура Палесся ў постацях і лёсах : матэр. Міжнар. навук. канф., 17–18 лістапада 2004 г. / рэд. кал. : Т.С. Нуждзіна, Г.М. Друк. – Мазыр. – С. 12–17.
72. Міцкевіч, В У. Старажытныя палескія тапонімы суфіксальна-флексійнага ўтварэння / В У. Міцкевіч // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: Праблемы вывучэння і захавання ў постчарнобыльскі час : зб. навук. арт. / рэд. кал.: А. А Станкевіч [і інш.]. – Гомель : ГГУ имени Ф. Скорины, 2006. – С. 254–258.
73. Пераход, В.Б. З тапаніміі Піншчыны / В.Б. Пераход // Имя и слово. – Брест, 2003.
74. Смаль, Н.Р. Назвы рэк і азёр басейна Заходняга Буга (лексіка-семантычны аспект) / Н.Р. Смаль // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове, фальклоры і літаратуры : матэрыялы Рэсп. навук. канф. – Брэст : БрДУ, 1994. – С. 97–100.
75. Сянкевіч, В.І. Афіцыйныя назвы населеных пунктаў і іх мясцовыя тапанімічныя варыянты (Кобрынскі раён) / В.І. Сянкевіч, С.А. Сянкевіч // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя : матэрыялы Міжнар. навук. канф. : у 2 ч. / рэд.: С.В. Арцёменка [і інш.]. – Брэст : Выд-ва С. Лаўрова, 1998. – Ч. 1. – С. 221–224.
76. Сянкевіч, В.І. Тапаніміка Кобрыншчыны : мадыфікацыі і альтэрнатыўнасць айканіміі / В.І. Сянкевіч, С.А. Сянкевіч // Прыроднае асяроддзе Палесся : сучасны стан і яго змены : матэрыялы Міжнар. навук. канф. : у 2 ч. – Брэст, 2002. – Ч. 1. – С. 160–161.

77. Фамелец, М. Семантика исторических названий улиц Пинска / М. Фамелец // Славянские языки : системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы Междунар. науч.-метод. конф.: в 2 ч. / редкол.: Е.И. Абрамова [и др.]. – Брест : Изд-во БрГУ, 2006. – С. 34–39.
78. Фамелец, М. Семантическая классификация урбанонимов Брестской области / М. Фамелец // Славянские языки : системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы IV Междунар. науч.-метод. конф. : в 2 ч. / под общ. ред. О.Б. Переход. – Брест : БрГУ, 2010. – Ч. 2. – С. 34–39.
79. Ціханчук, Т.В. З Гідраніміі Пабужжа / Т.В. Ціханчук, Н.Р. Якубук // Берасцейска-Пінскае Палессе: Мова, літаратура, гісторыя : матэрыялы канф., прысвеч. 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка, 24–25 кастр. 2002 г. – Брэст : Выд-ва С.Б. Лаўрова, 2002. – С. 111–114.
80. Ціханчук, Т.В. Састаўныя назвы гідрааб'ектаў Брэстчыны / Т.В. Ціханчук, Н.Р. Якубук // Актуальные вопросы славянской ономастики : материалы Междунар. науч. конф. / отв. ред. Р.М. Козлова, г. Гомель, 21–22 нояб. 2002г. – Гомель : УО "ГГУ имени Ф. Скорины". – 2002. – С. 261–264.
81. Якубук, Н.Р. Гідранімія басейна Заходняга Буга / Н.Р. Якубук // Весці АН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – Мінск, 1995. – № 2. – С. 116–121.
82. Якубук, Н.Р. Характэрныя асаблівасці айканіміі Пабужжа / Н.Р. Якубук // Единство восточно-славянских народов : прошлое, настоящее, перспективы : материалы науч. конф. – Гомель, 1995. – С. 162–163.
83. Якубук, Н.Р. Агульнае і спецыфічнае ў айканіміі і гідраніміі Пабужжа / Н.Р. Якубук // Праблемы адукацыі, навукі, культуры Беларускага Палесся : матэрыялы Міжнар. навук. канф. : у 3 ч. – Брэст, 1997. – Ч. III. – С. 20–21.
84. Якубук, Н.Р. Асаблівасці ўзаемадзеяння розных класаў тапонімаў Пабужжа / Н.Р. Якубук // Канцэптуальныя пытанні развіцця мовы, літаратуры і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа : матэрыялы Рэсп. навук. канф. / рэд.: М. Казачэнка [і інш.]. – Мазыр, 1998. – С. 198–200.
85. Якубук, Н.Р. Варыянтнасць у гідраніміі і айканіміі Пабужжа / Н.Р. Якубук // Жыццём слугуючы Айчыне : матэрыялы навук. канф. да 80-х угодкаў праф. Ф. Янкоўскага. – Брэст, 1999. – С. 59–60.
86. Якубук, Н.Р. Структурна-семантычная характарыстыка назваў лінейных аб'ектаў горада Брэста / Н.Р. Якубук // Рэгіянальныя асаблівасці Берасцейска-Пінскага Палесся ў мове і літаратуры : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 80-годдзю з дня нараджэння У. Калесніка. – Брэст, 2002. – С. 26–30.
87. Якубук, Н.Р. Гісторыя краю ў мясцовай тапаніміі / Н.Р. Якубук // Тадэвуш Касцюшка і яго час : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 20–21 мая 2004 г. – Брэст : Выдва УА "БрДУ імя А.С. Пушкіна", 2004. – С. 69–72.
88. Якубук, Н.Р. Спецыфіка намінацыі асобных катэгорый гідрааб'ектаў Пабужжа / Н.Р. Якубук // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы Респ. науч.-метод. конф. – Брест, 2004. – С. 129–132.
89. Якубук, Н.Р. Урбананімія г. Брэста (семантычны аспект) / Н.Р. Якубук // Мовы Вялікага Княства Літоўскага : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., г. Брэст, 18–19 мая 2004 г. / рэд. М.М. Аляхновіч. – Брэст, 2005. – С. 220–222.
90. Якубук, Н.Р. Гідранімія Беларусі (гістарыяграфія праблемы) / Н.Р. Якубук // Канцэптуальныя падыходы да рэалізацыі зместу філалагічнай адукацыі ў школе і ВНУ: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Рэсп. навук. канф., 21–22 кастр. 2004 г. – Брэст, 2005. – С. 281–284.
91. Якубук, Н.Р. Мадэль pluralia tantum у айканіміі Пабужжа / Н.Р. Якубук // V Рэсп. Калеснікаўскія чытанні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., прысвеч. 10-годдзю з дня смерці У.А. Калесніка, 24–26 лют. 2005 г. – Брэст, 2005. – С. 299–301.
92. Якубук, Н.Р. Мікратапанімія Пабужжа ў форме прыназоўнікава-іменных канструкцый / Н.Р. Якубук // Гістарычна-культурная спадчына Брэсцка-Пінскага Палесся : у 2 ч. – Брэст, 2006. – Ч. 2. – С. 237–242.
93. Якубук, Н.Р. Айконімы Пабужжа суфіксальнага ўтварэння / Н.Р. Якубук // Славянские языки : системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы Междунар. науч.-метод. конф. : в 2 ч. / редкол.: Е.И. Абрамова [и др.]. – Брест : Изд-во БрГУ, 2006. – Ч. 2. – С. 39–44.
94. Якубук, Н.Р. Айканімія Лунінеччыны / Н.Р. Якубук // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. філал. навук. Літаратуразнаўства. Мовазнаўства. – 2006. – № 2 (5). – С. 108–112.
95. Якубук, Н.Р. З мікратапаніміі вёскі Псышчава / Н.Р. Якубук // Берасцейшчына ў мове і літаратуры : матэрыялы рэгіян. навук.-практ. канф., Пінск, 29–31 мая 2007 г. – Брэст : Брэсцкі АВМПЦ ПА, 2007. – С. 143–148.
96. Якубук, Н.Р. Структурна-словаўтваральная характарыстыка айканіміі Пружаншчыны / Н.Р. Якубук // Имя и слово (проблемы семантико-прагматического взаимодействия в славянских языках) : материалы Междунар. науч. конф. : в 2 ч. – Брест : Изд-во БрГУ, 2007. – Ч. 2. – С. 311–315.
97. Якубук, Н.Р. Айканімія Жабінкаўшчыны / Н.Р. Якубук // Веснік Брэсцкага універсітэта. Серыя філалагічныя навукі. Літаратуразнаўства. Мовазнаўства. – 2007, № 2 (8). – С. 82–86.
98. Якубук, Н.Р. Айконімы Брэстчыны, матываваныя фларыстычнымі назвамі / Н.Р. Якубук // Веснік Брэсцкага універсітэта. Сер. філал. навукі. Літаратуразнаўства. Мовазнаўства. – 2008. – № 2 (10). – С. 154–162.
99. Якубук, Н.Р. Апелятыўная лексіка ў сістэме мікратапаніміі Пабужжа / Н.Р. Якубук // Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ : матэрыялы Рэсп. навук. канф., 28–29 сак. 2008 г. / рэд. У. А. Сенькавец. – Брэст : Альтэрнатыва, 2008. – С. 289–292.
100. Якубук, Н.Р. Асаблівасці словаўтварэння айконімаў Брэстчыны, суадносных з фларыстычнымі назвамі / Н.Р. Якубук // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы Междунар. науч.-метод. конф., 22–23 нояб. 2007 г. : в 2 ч. – Брест : Изд-во БрГУ. – 2008. – Ч. 2. – С. 311–315.
101. Якубук, Н.Р. Апелятыўная лексіка ў сістэме мікратапаніміі Брэстчыны/ Н.Р. Якубук // Гісторыка-тэарэтычныя актуаліі сучаснай філалогіі : матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практ. канферэнцыі, прысв. 70-годдзю з дня нараджэння вучонага-літаратуразнаўцы, педагога, праф. А.А.Майсейчыка. – Брэст : Альтэрнатыва, 2008. – С. 195–198.
102. Якубук, Н.Р. Айканімія Баранавіччыны ў структурных адносінах / Н.Р. Якубук // Каб жыло наша слова : зб. навук. арт. да 90-годдзя з дня нарадж. Ф. Янкоўскага / рэдкал.: М.І. Новік [і інш.]. – Брэст : Альтэрнатыва, 2009. – С. 73–76.
103. Якубук, Н.Р. Фларыстычныя найменні ў сістэме айканіміі Брэстчыны / Н.Р. Якубук // Мировой литературный процесс : автор–жанр–стиль : сборник научных трудов. – Брест : БрГУ, 2009. – С. 200–203.
104. Якубук, Н.Р. Асаблівасці словаўтварэння айканіміі Пабужжа / Н.Р. Якубук // Літаратура для дзяцей і юнацтва ў кантэксце суч. адукац. і выхав. праблем: матэрыялы рэсп. навук. канф. (Брэст, 13–14 сакавіка 2009г.). У 2 т. Т.2. Брэст: Альтэрнатыва, 2009. – С.177–180.

105. Якубук, Н.Р. З мікратапаміміі Брэстчыны / Н.Р. Якубук // Acta Albaruthenika, Rossika, Polonika: VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя “Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства” (Віцебск, 22–24 кастрычніка 2009г.) – Віцебск : УА “ВДУ імя П.М. Машэрава, 2009. Ч. 2. – С. 104–108.
106. Якубук, Н.Р. Тапанімія Пабужжа ў моўных адносінах / Н.Р. Якубук // Мова Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. артык. – Брэст : Альтернатива, 2010. – С. 107–109.
107. Якубук, Н.Р. Гідронімы бязафіксНага ўтварэння / Н.Р. Якубук // Асоба і творчасць Францішка Багушэвіча ў прасторы і часе: зб. навук. арт. да 170-годдзя з дня нараджэння Ф. Багушэвіча. – Брэст : Альтернатива, 2010. – С. 145–147.
108. Якубук, Н.Р. Структурна-словаўтваральная характарыстыка гідраніміі Заходняга Палесся / Н.Р. Якубук // Моўнакультурная прастора Берасцейшчыны : зб. навук. арт. – Брэст: Альтернатива, 2010. – С. 227–230.
109. Якубук, Н.Р. Адметныя рысы мікратапаніміі Іванаўшчыны / Н.Р. Якубук // Славянские языки : системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы IV Международной научно-методической конференции, Брест, 25-26 ноября 2009 г. – Брест: БрГУ, 2010. Ч. 2. – С. 197–202.
110. Якубук, Н.Р. З мікратапаніміі в. Олтуш Маларыцкага раёна / Н.Р. Якубук // Беларуская дыялекталогія. Матэрыялы і даследаванні. Вып. 1 / агульн. рэд. Л.П. Кунцэвіч, В.М. Курцова. – Мінск, 2010. – С. 162–164.
111. Якубук, Н.Р. Назвы ўрочышчаў в. Псышчава і яе ваколіц / Н.Р. Якубук // Беларуская дыялекталогія. Матэрыялы і даследаванні. Вып. 1 / агульн. рэд. Л.П. Кунцэвіч, В.М. Курцова. – Мінск, 2010. – С. 164–168.
112. Якубук, Н.Р. Урбананімія горада Баранавічы ў семантычных адносінах / Н.Р. Якубук // Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук арт. у 2-х ч. – Брэст : Альтернатива, 2011. Ч. 2. – С. 191–194.
113. Якубук, Н.Р. Узаемаадносіны паміж тапанімічнымі класамі Пабужжа ў структурна-словаўтваральным аспекце / Н.Р. Якубук // Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук арт. у 2-х ч. – Брэст : Альтернатива, 2011. Ч. 2. – С. 188–190.
114. Якубук, Н.Р. Мікратапонімы Брэстчыны, матываваныя землямробчай лексікай / Н.Р. Якубук, В. Янусік // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі : зб. навук. арт. у 2 ч. Ч. 2. – Брэст : Альтернатива, 2012. – С. 184–187.
115. Якубук, Н.Р. Матывавальныя асновы адапелятыўных айконімаў Пабужжа (матэрыялы да слоўніка) / Н.Р. Якубук // Славянские языки: системно-описательный и социокультурный аспекты исследования : материалы V Междунар. науч.-метод. конф., Брест, 24-25 нояб. 2011 г. В 2 ч. Ч. 1. – Брест : Альтернатива, 2012. – С. 75–78.
116. Якубук, Н.Р. Словаўтваральныя асаблівасці гідраніміі Пабужжа / Н.Р. Якубук // “Ф.М. Достоевский в современном поликультурном пространстве” : сб. материалов междунар. науч.-практ. конф.; Брест–Иваново , 6–7 октября 2011 г. – Брест : БрГУ, 2012. – С. 212–215.
117. Якубук, Н.Р. Айконімы Пабужжа антрапанімічнага паходжання / Н.Р. Якубук // Моўнакультурная прастора Брэсцка-Пінскага Палесся : зб. навук. арт. – Брэст : Альтэрнатыва, 2013. – С. 217–221.
118. Якубук, Н. Р. Адапелятыўныя айконімы Пабужжа (матэрыялы да слоўніка) / Н. Р. Якубук // Беларуская дыялекталогія. Матэрыялы і даследаванні : зб. навук. арт. Вып. 3. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – С. 137–140.
119. Якубук, Н.Р. Тапанімічныя класы Пабужжа: агульнае і спецыфічнае / Н.Р. Якубук // Мова і культура : зб. навук арт. / рэдкал. : В.М. Касцючык і інш; пад агульн. рэд. Л.В. Леванцэвіч. – Мінск : РІВШ, 2014. – С. 219–223.
120. Якубук, Н.Р. Семантычныя мікратапонімы Пабужжа / Н.Р. Якубук // Нацыянальна-культурны кампанент у літаратурнай і дыялектнай мове : зб. навук. арт. / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна ; пад агул. рэд. С.Ф. Бут-Гусаім ; рэдкал.: С.Ф. Бут-Гусаім. – Брэст : БрДУ, 2015. – С. 175–179.
121. Якубук, Н.Р. Семантычныя адметнасці мікратапаніміі Брэстчыны / Н.Р. Якубук // Моўная адзінка ў кантэксце часу : зб. матэрыялаў II Рэспубл. навук.-практ. канф., Брэст, 18 лістапада 2016 г. / Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна ; рэдкал.: Л.В. Леванцэвіч [і інш.]. – Брэст : БрДУ, 2016. – С. 216–221.

*Паступіў у рэдакцыю 18.01.2018 г.*